Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся !

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 170 (242) | Нядзеля, 28 ліпеня 1940 г. | Цана 10 кап.

НЯХАЙ ЖЫВЕ Ваенна-Марскі Флот Совецкага Саюза — надзейная ахова совецкіх марскіх граніц!

ВАЕННА-МАРСКІ ФЛОТ СССР

Совецкі Саюз — вялікая марская дзяржава. Яго велізарная тэрыторыя амываецца двума акіянамі і чатырнаццаю марамі, праз якія праходзяць важнейшыя шляхі, звязваючыя СССР з усім светам. На 48 тысяч кілометраў цягнуцца марскія граніцы СССР.

Для таго, каб жыццё і праца народаў такой велізарнай краіны, як наша, надзейна ахоўваліся ад усякіх ворагаў, для таго, каб можна было спакойна падтрымліваць гандлёвыя і культурныя сувязі з другімі дзяржавамі, нам патрэбна на раду з сільнай сухаземнай Чырвонай Арміяй мець і магутны Ваенна-Марскі Флот.

Ваенна-Марскі Флот заўсёды меў і мае выключнае значэнне для абароны нашай краіны.

Выдатна гісторыя развіцця нашага ваеннага флота.

Доблесна сражаліся за радзіму рускія маракі, заўсёды адрозніваючыся вялікім гераізмам, знаходлівасцю, уменнем выходзіць з амага цяжкага становішча і пераамагаць мацнейшых праціўнікаў.

Залатымі літарамі запісана ў лігу сусветнай гісторыі буйнейшая перамога рускіх на моры ля Гангуце ў 1714 годзе, калі разбіт самы моцны ў той час дскі флот. У 1770 годзе ў ля заходніх ленскай бухце, у 1853 годзе ськоў Турцыі, а ў турэцкім горадзе Сінопе насцю былі знішчаны мацнейшыя эскадры турак.

З 24 буйных ваенна-марскіх сражэнняў, у якіх удзельнічаў наш флот на працягу больш 200-гадовага свайго існавання да рэвалюцыі, рускія маракі выйгралі 21 сражэнне.

Наш народ выхаваў такіх буйных палкаводцаў і мораплавацеляў, як Ушакоў, як герой абароны Севастопаля адмірал Нахімаў, адмірал Макараў, мораплаватель Дзежнеў, палярны даследвацель Седоў і многія другія, імёны якіх вядомы ўсяму свету.

У 1905 годзе ў ваенна-марскім флоце адбылося рэвалюцыйнае паўстанне супроць рускага царызма. Гэтае паўстанне, якое ўспыхнула на „Пацёмкіне" — буйнейшым броненосцы Чорнаморскага флота, — адыграла вялікую ролю ў далейшым развіцці першай рускай рэвалюцыі.

У 1917 годзе, пасля лютаўскай буржуазнай рэвалюцыі, маракі Балтыйскага флота разам з рабочымі чырвонага Піцера былі галоўнай апорай большэвікоў у іх узброенай барацьбе супроць буржуазнага Часовага ўрада Керэнскага. Калі па ўсёй Расіі яшчэ царыла ўлада Керэнскага, у цэнтры Балтыйскага флота — у Кранштаце — ужо з сярэдзіны 1917 года існавала совецкая ўлада: Кранштадскі совет рабочых і матроскіх дэпутатаў адмовіўся прызнаваць уладу буржуазнага Часовага ўраду.

Маракі заўсёды былі ў перадавых радах, геройскі сражаўшыхся за совецкую ўладу. Ваенны карабль Балтыйскага флота — крэйсер „Аўрора", — увайшоўшы ў Неву ў кастрычніку 1917 года, адкрыў агонь па Зімняму Палацу — апошняй апоры буржуазнага ўрада Керэнскага. Вечарам тагож я матросы Балтыкі разам з петраградскімі рабочымі ўзялі штурмам Зімні Палац.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года партыя большэвікоў пасылае рэвалюцыйных матросаў на самыя адказныя баявыя ўчасткі. Маракі беззаветна сражаліся на ўсіх франтах грамадзянскай вайны, геройскі абараняючы совецкую ўладу. У 1919 годзе яны адважна біліся на Балтыйскім моры супроць каралеўскага англійскага флота, разбілі яго і прымусілі ганебна ўцякаць ад нашых берагоў пасля страты 16 караблёў. Сярод пайшоўших на дну англійскіх суднаў былі падводная лодка „Л-55", патопленая нашым мінаносцам „Азард" (цяпер „Артём"), мінаносец „Вітторыя", патоплены совецкай падводнай лодкай „Пантэра", і др.

Чырвоныя матросы геройскі біліся з ворагамі совецкай улады на моры і на сушы. Яны былі ўсюды, дзе з'яўляліся белагвардзейцы і інтэрвенты: матросы былі на бронепаязадах і ў кулямётных камандах палкоў Чырвонай Арміі, ляталі ў якасці лётчыкаў і былі кавалерыстамі ў конніцы Будзённага.

Асаблівую вялікую ролю ў грамадзянскай вайне адыгралі маракі на рэках і азёрах Совецкай Расіі. Простыя рачныя параходы і баржы маракі хутка ператваралі ў грозныя ваенныя караблі і пры дапамозе іх бязлітасна грамілі ворагаў. Так былі створаны маракамі пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі Астрахана-Каспійская, Волжская, Дняпроўская і другія флатыліі.

Многа гераічных подвігаў зрабіла гэтая слаўная флатылія ў Лоева, Мазыра, Чарнобыля і ў радзе другіх месц.

Разбітая ў баях 1920 года панская Польшча да апошняга дня свайго бясслаўнага існавання не магла забыць, як моцна дасталося ёй ад Чырвонай Арміі і маракоў Дняпроўскай флатыліі. Паны думалі зноў захапіць Украіну і адпомсціць большэвікам.

З гэтай мэтай панская Польшча пачынаючы з 1920 года няспынна будавала свой флот на Прыпяці, затрачваючы на гэтую справу велізарныя сродкі. Аднак гэты флот не вытрымаў баявой сустрэчы з совецкай Дняпроўскай флатыліяй.

17 верасня 1939 года Дняпроўская флатылія атрымала баявы загад: разам з часцямі Беларускага фронта ўзяць курс на захад і перайсці дзяржаўную граніцу, каб прыняць удзел ва ўзброеным вызваленні з-пад панскага іга сваіх адзінакроўных братоў — украінцаў і беларусоў.

Паны ўцякалі без аглядкі, кідаючы і знішчаючы свае караблі, насіўшыя кічліва гучныя назвы: „Недасягаемы", „Незвычайны" і інш.

Капіталістычнае акружэнне нашай краіны, шалёная гонка ўзбраенняў у імперыялістычных краінах, пагроза нападу на СССР прымушаюць Совецкую краіну няспынна павышаць і ўмацоўваць абарону. Пагэтаму партыя і ўрад паставілі задачу — будаваць вялікі совецкі флот.

Глава совецкага ўрада тав. Молатаў гаварыў на першай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР у студзені 1938 года:

— „У магутнай совецкай дзяржавы павінен быць адпавядаючы яе інтарэсам, дастойны нашай вялікай справы, марскі і акіянскі флот".

Выконваючы намечаную праграму будаўніцтва такога флота, Совецкі Саюз штогод будуе і спускае на ваду новыя караблі. Па колькасці ўзброенай магутнасці наш падводны флот з'яўляецца цяпер самым моцным ва ўсім свеце падводным флотам. Мы маем таксама і самы моцны ў свеце тарпедны флот, які нясе грозныя для ворага, смертаносныя міны.

Ваенна-Марскі Флот — надзейная варта граніц Совецкай краіны, верны памочнік слаўнай і магутнай Чырвонай Арміі.

У апошніх баях з фінскай белагвардзейшчынай маракі Чырвонасцяжнай Балтыкі актыўна дапамаглі Чырвонай Арміі бязлітасна граміць манергеймаўскія банды. Балтыйцы яшчэ раз даказалі, якую несакрушальную магутнасць прадстаўляе цяпер наш Ваенна Марскі Флот, які папаўняецца штогод навейшымі караблямі, узброенымі выдатнай артылерыяй, аснашчонымі высокай ваеннай тэхнікай і ўкамплектаванымі высокакваліфікаваным асабовым саставам.

У гераічных баях з белафінамі асабліва выдзеліліся падводнікі Чырвонасцяжнай Балтыкі і лётчыкі марской авіяцыі. За доблесныя подвігі ўрад узнагародзіў экіпажы трох падводных лодак орденам Чырвонага Сцягу. 23 маракі і лётчыкі удастоены звання Героя Совецкага Саюза; звыш 2000 камандзіраў, чырвонафлотцаў і палітработнікаў флота, лётчыкаў узнагароджана орденамі і медалямі.

З слаўнымі дасягненнямі прыходзіць Ваенна-Марскі Флот да дня свайго свята 28 ліпеня. Гэта Дзень Ваенна-Марскога Флота, які згодна пастановы совецкага ўрада і партыі, з'яўляецца штогоднім усенародным святам.

Звязаныя цеснымі узамі дружбы з доблеснымі абаронцамі марскіх рубяжоў Совецкага Саюза, працоўныя ў гэты дзень робяць агляд сваім марскім сілам. Яшчэ і яшчэ раз совецкія маракі разам з народам дэманструюць сваю любоў да партыі Леніна-Сталіна, намячаюць шляхі далейшага ўмацавання абароны социялістычнай бацькаўшчыны і мабілізуюць на гэтыя справы новыя сілы.

Вітаюць Чырвоны Ваенна-Марскі Флот

Дамачэво. Упершыню вызваленыя з-пад іга польскіх паноў працоўныя заходніх абласцей удзельнічаюць сёлета ў свяце Ваенна-Марскога Флота. За час існавання тут совецкай улады народ моцна палюбіў сваю армію — вызваліцельніцу.

На дакладах і гутарках, якія праводзіліся ў вёсках і калгасах раёна, сяляне з надзвычайнай увагай слухалі дакладчыкаў, якія апавядалі аб мужных і гераічных чырвонафлотцах.

У калгасе „Вольная праца", Падліпскага сельсовета, сабралося больш 150 калгаснікаў са сваімі сем'ямі. Яны горача віталі совецкіх чырвонафлотцаў Балтыкі, мужна біўшыхся з фінскімі белабандытамі і паказаўшых прыклады доблесці і геройства ў барацьбе з ворагамі совецкага народа. У Дубіцкім сельсавеце на дакладзе прысутнічала 300 сялян, у Чэрскім — 185.

27 ліпеня ў раённым цэнтры праведзен ўрачысты вечар, прысвечаны Дню Ваенна-Марскога Флота. Пасля даклада адбыўся канцэрт мастацкай самадзейнасці. 28 ліпеня ў 12 гадзін дня ў парку адбудзецца масавае гулянне, дзе будуць прымацца нормы на абаронныя значкі і наладжаны ваенныя гульні.

Радасна сустракаюць свята Ваенна-Марскога Флота

З вялікай радасцю сустракаюць працоўныя Брэсцкага раёна Дзень Чырвонага Ваенна-Марскога Флота. Ва ўсіх вёсках раёна на ўрачыстых сходах сялян будуць праведзены гутаркі і даклады аб Чырвоным Флоце.

У дзень свята адбудзецца 7 куставых сходаў дапрызыўнікаў Брэсцкага раёна. Яны сустрэнуцца з ордэнаносцамі — удзельнікамі гераічных баёў з фінляндскімі белабандытамі. Для дапрызыўнікаў арганізуюцца курсы па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці.

С. Кучмінскі.

На радзіме Мацюшэнка

Сяло Дзеркачы Харкаўская область, 26 ліпеня (ТАСС). Сяло Дзеркачы — радзіма аднаго з кіраўнікоў гістарычнага паўстання на броненосцы „Пацёмкін" — Афанасія Мацюшэнка. Днямі ў сяле адбыўся вечар, прысвечаны выступленню рэвалюцыйных маракоў у 1905 годзе. Жыхары сала рашылі арганізаваць у доміку, дзе жыў земляк Мацюшэнка, музей яго імені. Музей адкрыецца у Дзень Ваенна-Марскога Флота.

Здаюць норму на абаронныя значкі

Брэсцкі гарадскі совет Асоавіяхіма да Дня Ваенна-Марскога Флота падрыхтаваў 150 значкістаў ПВХА, гарадскі совет Чырвонага Крыжа ужо выдаў значкі ГСА I ступені 195 чалавекам. Зараз у гуртках па падрыхтоўцы значкістаў ГСА I ступені навучаецца 686 чалавек, з якіх 150 чалавек здадуць нормы да Дня Ваенна-Марскога Флота.

З вялікай актыўнасцю рыхтуюцца да абароны сваёй радзімы студэнты Брэсцкага педвучылішча. У 8 гуртках яны падрыхтавалі 147 чалавек, якія здалі ужо нормы і атрымалі значкі ГСА I ступені. Выконваюць свае абавязацельствы і рабочыя друкарні. Яны падрыхтавалі 19 значкістаў процівапаветранай абароны і 21 значкіста „Гатоў да санітарнай абароны", 19 членаў Асоавіяхіма маюць па 2 абаронныя значкі. З першага жніўня пачнуць працаваць яшчэ два гурткі, якія будуць рыхтаваць значкістаў ПВХА і ГСА. У кожным гуртку будзе займацца па 20 чалавек.

Курсы начальнікаў і палітрукаў груп процівапаветранай абароны

З першага жніўня гарадскі совет Асоавіяхіма адкрывае у Брэсце курсы па падрыхтоўцы начальнікаў і палітрукаў груп самаабароны. На гэтых курсах будзе займацца 40 чалавек, выдатнікаў абаронай работы. Яны пройдуць 100-гадзінную праграму без адрыва ад вытворчасці.

У праграму ўключаны лекцыі па процівапаветранай і хімічнай абароне і агульнапалітычнай падрыхтоўцы.

Рысунак В. Лісевіча і В. Баркова. Фота-кліше ТАСС.

СЕМЕН КИРСАНОВ.

СОВЕТСКИЙ ФЛОТ

Война бушует
на морских широтах,
грабительскою яростью горя...
Вот почему
широкой грудью флота
прикрыли мы
советские моря.
Вот почему
у орудийных башен,
у каждой бухты,
у любой реки,
на Балтике,
на Черноморье нашем
испытанные
встали моряки.
Вот почему
у северных сияний,
за каждым всплеском
мурманским, седым,
и за дымком
на Тихом океане
мы с кораблей
внимательно следим.

Кто любит море —
понимает море:
оно не прочь
барашками гулять;
смотрю в бинокль —
в огромном кругозоре
мечтательная,
розовая гладь...
Все ветерки
ушли домой,
на отдых...
Но вдруг вскипело,
поднялось оно;
стальными спинами
подводных лодок
в одно мгновенье
море взбугрено!
Знакомый флаг
над шумной пеной вьется,
кружатся
гидропланные рои,
и вот на борт
выходят
краснофлотцы —
подводные
защитники мои!

Кто любит землю —
защищает море!
И как спокойно
жителям Невы,
когда рука орудья
на линкоре
обводит небо
пальцем броневым.
Спокойна
океанская дорога
в прожекторном
белесом рубеже,
когда за тишью
Золотого Рога
советский крейсер
стал настороже.

И Севастополь,
окаймленный славой
прошлостолетних
русских моряков,
синеет
сталегрудою заставой
горячих
черноморских берегов.

Громады
умной и послушной стали,
в их линиях
и сила и покой...
Они
на наших верфях
вырастали
и сталинскою
подняты рукой.
Здесь им вычерчивали
стройность линий,
здесь плавили
добротную руду,
тут —
стапеля
рубили для твердыни,
учились
корабельному труду.
И в звонких кружевах
лесов и кранов
взрослели
и готовились суда,
и шли здавать
зачет
на капитанов
восторженные юноши
сюда!
Советский Флот —
стальная наша сила —
любой
готова
встретить ураган,
так, —
чтобы лишь обломки
приносило
от сил врага
к далеким берегам!
Советский Флот,
расти и крепни втрое,
и зорко
вахту славную неси!
И пусть рождает
молодых героев
отвагою
волнуемая синь!
И в свежем ветре
напевают снасти
о великанах
грозовых морей...
За Сталина,
за коммунизм,
за счастье
непобедимой
родины
моей!

Аб рабоце камісіі па ўдакладненню граніцы паміж Мангольскай Народнай Рэспублікай і Манчжоу-Го ў раёне мінулагодняга канфлікта

У пачатку жніўня г. г. у гор. Чыце прыступіць да работы змешаная камісія з упаўнаважаных Мангольскай Народнай Рэспублікі — камдыва Доржы і палкоўніка Смірнова Д. І. і ўпаўнаважаных Манчжоу-Го — Сімомура, Нобусада і Буйманто.

Камісія ўстановіць на мясцовасці пагранічныя знакі ў раёне мінулагодняга канфлікта, а таксама саставіць карты і іншыя дакументы, прадугледжаныя пагадненнем ад 18 ліпеня г. г. паміж Намеснікам Народнага Камісара замежных спраў С. А. Лазоўскім і японскім паслом п. Того, якое было заключана ў ажыццяўленне пагаднення ад 9 чэрвеня г. г. паміж Народным Камісарам замежных спраў В. М. Молатавым і японскім паслом п. Того.

Да перагавораў аб парадку перасялення асоб германскага паходжання з Бесарабіі і Паўночнай Букавіны

23 ліпеня ў Маскве пачаліся перагаворы аб эвакуацыі з Бесарабіі і Паўночнай Букавіны германскіх грамадзян і асоб германскага паходжання, жадаючых пераселіцца ў Германію.

Германскую дэлегацыю для перагавораў узначальвае генеральны консул першага класа п. Нольдэкен, совецкую дэлегацыю — замочнік генеральнага сакратара НКЗС т. Васюкоў.

Караблі ўваходзяць у Няву

ЛЕНІНГРАД, 26 ліпеня (ТАСС). У Няву ўвайшлі першыя караблі, якія будуць удзельнічаць 28 ліпеня ў парадзе ваенных суднаў. З інтарэсам разглядаюць ленінградцы падводную лодку „Щ-324", аддаўшую якар ніжэй Ліцейнага маста. Краіна добра ведае аб подвігах гэтага чырвонасцяжнага карабля, доблесна выканаўшага суровай зімой заданне камандвання. На Няве ленінградцы ўбачаць праслаўлены мінаносец „Арцём".

На некаторыя з караблёў будуць арганізаваны экскурсіі працоўных. 28 ліпеня на падводных лодках, мінаносцах і старажавых суднах успыхнуць агні святочнай ілюмінацыі. Горад Леніна пачаў упрыгожвацца да Дня Ваенна-Марскога Флота.

Беспасадачны пералёт самалёта „Украіна" па маршруту Хабараўск—Львоў

27 ліпеня з горада Хабараўска вызначан старт двухматорнага самалёта „Украіна" ў дальні беспасадачны пералёт па маршруту Хабараўск—Львоў з пасадкай на ўчастку Мазыр — Львоў.

У састаў экіпажа ўваходзяць камандзір самалёта капітан Марыя Пятроўна Несцярэнка, другі пілот капітан Марыя Грыгор'еўна Міхалёва, штурман старшы лейтэнант Ніна Іванаўна Русакова.

Калі надвор'е не перашкодзіць, старт з Хабараўска адбудзецца ў 8 гадзін раніцы па маскоўскаму часу.

(ТАСС).

Адкрыццё Паўночнага Ферганскага канала

ТАШКЕНТ, 25 ліпеня (ТАСС). Сёння ў паўночных раёнах Ферганскай далины адбылося народнае свята, прысвечанае адкрыццю Паўночнага Ферганскага канала. Уздоўж усёй 160-кіламетровай трасы будаўнікі канала радасна сачылі за імклівым патокам вады. Тысячы гектараў бавоўнавых палёў атрымалі ваду.

У сяленні Пап адбыўся пяцітысячны мітынг, пасля якога пачалося грандыёзнае свята.

Удзельнікі мітынга паслалі прывітанні таварышам Сталіну і Молатаву.

Прыём у педагагічныя і настаўніцкія інстытуты заходніх абласцей УССР і БССР

Камітэт па справах вышэйшай школы пры Саўнаркоме СССР дазволіў Наркамасветы Украіны і Беларусі прыняць у львоўскі і беластоцкі педагагічныя інстытуты і настаўніцкія інстытуты заходніх абласцей УССР і БССР асоб, якія вытрымалі ўступныя экзамены, без прадстаўлення атэстата аб скончаній сярэдняй школы.

Камітэт па справах вышэйшай школы дазволіў таксама дапусціць у 1940 годзе да ўступных экзаменаў у малдаўскі педагагічны інстытут асоб, скончыўшых у класаў сярэдняй школы.

(ТАСС).

У ЧЭСЦЬ СВЯТА

На Жабінкаўскім пункце Заготзярно вялікае ажыўленне. З самай раніцы да позняга вечара да склада пад'язджаюць падводы, гружаныя зярном новага ўраджаю. Калгасы і аднаасобныя гаспадаркі з першых-жа абмалотаў вязуць на здатачны пункт для здачы дзяржаве добранаснае зярно.

Калгас імені Сталіна, Глымбокаўскага сельскага совета, у чэсць дня Ваенна-Марскога Флота першым у раёне 27 ліпеня выканаў гадавы план хлебапаставак. Здадзена дзяржаве 9.501 кілаграм збожжа. 46 аднаасобных гаспадарак вёскі Багуславічы і Багны здалі дзяржаве 3.836 кілаграмаў жыта.

А. Махнач.

Заканчваецца будаўніцтва шклозавода

Гайнаўка. У Маланарэўскім сельскім совеце будуецца вялікі шкляны завод. Пабудаван ужо галоўны корпус. На будаўніцтве работае каля 800 рабочых. Па сваёй ініцыятыве яны пачалі ўжо нарыхтоўваць для завода паліва. Нарыхтавана 500 тон торфу і 5 тысячы кубічных метраў дроў. Для будаўніцтва выкарыстоўваюцца мясцовыя рэсурсы. Лесаматэрыялы і цэгла робяцца на месцы.

На заводзе будзе працаваць 1200 рабочых.

Ваенна-марскі флот у сучаснай вайне

Вядзеў'емнай часткай узброеных сіл марскіх дзяржаў з'яўляецца флот. У некаторых дзяржавах флот — основа іх ваеннай магутнасці. Так былым Галандыя і Іспанія, а цяперашні час Англія, ЗША і Японія магутнасць сваіх узброеных сіл разглядаюць перш усяго з пункту погляду становішча ваенна-марскога флота.

Агрэсіўная палітыка Англіі заўсёды апіралася на наяўнасць такога флота, які перавышаў-бы ў разы любы флот магчымага праціўніка. Перад другой імперыялістычнай вайной у англійскім ваенным флоце налічвалася звыш 500 ваенных караблёў агульным таннажам каля 1,3 мільёна тон.

Ваенна-марскі флот сёнешняга дня — вельмі складаная арганізацыя. Ён складаецца з надводных і падводных караблёў розных класаў, берагавой абароны, марскіх авіяцыі і ваенна-марскіх баз.

У сувязі з развіццём новых баявых сродкаў, спосабы і ўсяляк паўка вядзення вайны на моры зараз ускладніліся. Моцна павялася значнае спачатку падводных лодак, а затым і авіяцыі. Значна вырасла роля лёгкіх падводных караблёў у правядзенні аперацый на моры. Усе класы надводных караблёў перацярпелі істотныя змяненні: павысіліся мнабойнасць, хуткасць і магутнасць артылерыйскага ўзбраення караблёў, баявая магутнасць торпедаў і міны. Дастаткова сказаць, што вага метала, выкідваемага ў адну мінуту гарматамі лінкора ў 1912 годзе была роўна 4.632 кілаграмам, а зараз — каля 13 тысяч кг. Нарэшце, караблі атрымалі лепшую плывучасць і вялікую хуткасць.

Наспынная гонка ўзбраенняў у прадваенныя годы прывяла да ўмацнення не толькі флотаў Вялікабрытаніі, ЗША і Японіі, але і Італіі, Германіі і іншых краін. Пабудаваны былі сотні баявых караблёў розных класаў, створаны магутныя падводныя і паветраныя флоты, абсталяваны новыя ваенна-марскія базы і апорныя пункты на розных ваенна-марскіх тэатрах.

* * *

На ваенна-марскія флоты ўскладаюцца наступныя тры асноўныя задачы:

Знішчэнне ўсяго флота праціўніка або яго часткі. Такая задача стаіцца, альбо як галоўная мэта, забяспечваючая паспяховае вырашэнне не толькі вайны на моры, але і ў цэлым узброенага спаборніцтва, альбо як сродак для стварэння спрыяючых умоў, дазваляючых флоту пераможца выканаць другія бліжэйшыя задачы.

У мінулай вайне Германія імкнулася знішчэннем часцей англійскага флота параўнаць свае сілы з Англіяй і зрабіць іх здольнымі даць рашучы бой на моры. У сучаснай вайне дзеянні лёгкіх сіл германскага флота і асабліва яе авіяцыі вырашаюць задачу знішчэння часцей англійскага флота. Найвялікшы ў свеце англійскі флот пад ударамі авіяцыі немцаў і іх лёгкіх караблёў, падтрымліваемых крэйсерамі і лінкорамі, церпіць паражэнне за паражэннем і губляе з свайго баявога састава каштоўныя караблі: лінкоры, авіяносцы, крэйсеры, мінаносцы.

Барацьба за марскія шляхі зносін. Гэта барацьба праводзіцца ваенна-марскімі флотамі, з аднаго боку для дасягнення бязапаснасці ўласных гандлёвых і ваенных камунікацый, якія забяспечваюць метраполію сыравінай і войскамі, і з другога — з мэтай прарваць марскія зносіны праціўніка, адрэзаць праціўніка ад крыніц, узмацняючых яго супраціўленне.

У бягучай вайне Германія для парушэння гандлёвых сувязей праціўніка прымяняе ўсе баявыя сродкі, пачынаючы ад пасылкі надводных караблёў, падводных лодак і канчаючы масавым скарыстаннем новай суровай зброі — авіяцыі. За паўгода вайны германскаму флоту і галоўным чынам падводным лодкам удалося знішчыць 389 варожых і нейтральных суднаў, агульным водазмяшчэннем у 1.300 тысяч тон.

Германскія самалёты з пачатку вайны па 1 сакавіка 1940 года патапілі 65 суднаў агульным таннажам у 75 тысяч тон і пашкодзілі і часткова вывялі са строя 52 судны водазмяшчэннем да 200 тысяч тон. Да гэтага трэба яшчэ дадаць нямалую колькасць караблёў саюзнікаў, загінуўшых ад мін, пастаўленых германскімі самалётамі.

Менш удалымі аказаліся дзеянні надводных караблёў па камунікацыях. Пасылка германскага лінкора „Адмірал граф Шпее" ў акіян толькі адцягнула велізарныя сілы англічан з Паўночнага мора, а ў рэзультаце закончылася пагібеллю гэтага лінкора.

Барацьба за берагі. Мэта яе — забеспячэнне недатыкальнасці ўласнага ўзбярэжжа, або захоп шляхам высадкі дэсанта на тэрыторыі праціўніка.

* * *

Да першай імперыялістычнай вайны і нават у пачатку яе флот дзейнічаў у адрыве ад арміі. Але ўжо ў канцы вайны 1914 — 1918 гг. і асабліва ў бягучай вайне баявыя дзеянні флота цесна ўвязваюцца с дзеяннямі арміі. Узгадненне дзеянняў усіх узброеных сіл Германіі паказвае ўзоры аперацый па захопу і ўтрыманні тэрыторыі і апорных ваенна-марскіх пунктаў і баз праціўніка (у Нарвегіі, Галандыі, Бельгіі і Францыі).

У бягучай вайне ваенна-марскі флот дзейнічае ў новых, складаных умовах. „Паветраная небяспека" набыла такія пагражаючыя формы, што зусім па-новаму паставіла пытанне аб абароне надводных караблёў не толькі ў моры, але і ў базах. Пад ударамі германскай авіяцыі англійскі флот, напрыклад, быў пазбаўлен нармальнага базіравання ў паўночных базах Усходняй Англіі. Упершыню ў гісторыі марскіх войн лінейны карабль — гэты магутны марскі гігант, які каштуе больш 100 мільёнаў рублёў, — аказаўся падвергнутым смяротным ударам з боку пікіруючага самалёта - бамбардыроўшчыка, малюсенькага па размерах і нікчэмнага ў параўнанні з лінкорам па каштоўнасці. Лінейны карабль, разумеецца, застаецца „станавым хрыбтом" ваенна-марскога флота. Паўстае толькі задача прыстасавання канструкцыі і ўзбраення лінкора да новых баявых сродкаў праціўніка.

Узаемадзейнічаючы з арміяй і авіяцыяй, германскі ваенна-марскі флот забяспечыў захоп і ўтрыманне апорных ваенна-марскіх пунктаў на тэрыторыі Нарвегіі. Рашаючую ролю пры гэтым адыграла панаванне нямецкай авіяцыі ў паветры, што прымусіла англічан у канечным выніку зняць свае войскі і вярнуць іх назад.

У той-жа час наяўнасць магутнага флота ў Англіі, не гледзячы на актыўныя дзеянні германскай авіяцыі, дазволіла Англіі захаваць і перакінуць з Дзюнкерка на астравы амаль увесь экспедыцыйны корпус. Флот Англіі, не гледзячы на вялікія страты, прадаўжае заставацца грознай сілай.

Германскі флот значна слабей англійскага ў надводных караблях. Аднак немцы маюць моцны падводны флот і грозную, тэхнічна аснашчоную авіяцыю. Ужываючы новыя баявыя сродкі на моры — магнітную міну, самалёт-пікіроўшчык і паветраныя дэсанты, германскі ваенна-марскі флот нанёс рад сур'ёзнейшых удараў свайму магутнаму марскому праціўніку. Захапіўшы ўзбярэжжа Галандыі, Бельгіі і Францыі ў паўднёвай частцы Паўночнага мора, Германія з дапамогай свайго флота, дзейнічаючага ў англійскім канале па камунікацыях праціўніка, дасягнула расчынення саюзных армій і перарвала найкарацейшую паміж імі сувязь.

Цяжка прадсказаць далейшы ход падзей на моры, але ясна, што выяўленне ролі і новых метадаў скарыстання марскіх сіл у разгортваючайся другой імперыялістычнай вайне з'яўляецца справай бліжэйшага будучага.

В. Баранчук,
капітан трэцяга ранга.

ВАЙНА ПАМІЖ АНГЛІЯЙ І ГЕРМАНІЯЙ

ЛОНДАН, 26 ліпеня (ТАСС). Як паведамляе Рэйтэр, учора над паўднёва - ўсходнім узбярэжжам Англіі адбываўся вялікі паветраны бой. 80 германскіх самалётаў спрабавалі атакаваць караван англійскіх суднаў, шоўшых пад канвоем ваенных караблёў. Насустрач вылецелі знішчальнікі. Зенітныя батарэі адкрылі агонь. Германскім бамбардыроўшчыкам удалося скінуць некалькі бомб. Шкоды нязначныя. Збіта 20 непрыяцельскіх самалётаў. Англійская авіяцыя страціла 5 знішчальнікаў.

Зводка камандвання германскай арміі

БЕРЛІН, 26 ліпеня (ТАСС). У зводцы вярхоўнага камандвання германскай арміі паведамляецца: „Германская авіяцыя падвергла бамбардыроўцы аэрадромы Цэнтральнай Англіі і радыёстанцыю ў Дуўры.

У выніку нападу па караван суднаў у Ла-Маншы з 23 суднаў патоплена 11, тры параходы моцна пашкоджаны. Страты гандлёвага флота праціўніка за адзін учарашні дзень склалі 63 тысячы тон. У раёне Ла-Манша адбыўся паветраны бой, збіта 9 англійскіх самалётаў. Германскія страты складаюць два самалёты.

Камунікэ англійскага міністэрства авіяцыі

ЛОНДАН, 26 ліпеня (ТАСС). У камунікэ міністэрства авіяцыі гаворыцца, што ў ноч на 25 ліпеня англійскія самалёты бамбардыравалі докі ў Эмдэне, Вільгельмсгафене і Гамбургу, авіяцыйныя заводы ў Вісмары і Венцэндорфе і базы марской авіяцыі ў Боркуме і Тэкселе. Усе самалёты вярнуліся назад.

Англійская авіяцыя ў ноч на 26 ліпеня бамбардыравала раёны Паўночнай, Заходняй і Сярэдняй Германіі. Шкоды нязначныя. Ваенныя аб'екты не пацярпелі. Ноччу збіта 5 самалётаў праціўніка. Агульныя страты праціўніка ў паветры за ўчарашні дзень склалі 23 самалёты. Дзевяць германскіх самалётаў не вярнуліся на свае базы.

Гандлёвае пагадненне паміж Англіяй, Іспаніяй і Партугаліяй

ЛОНДАН, 26 ліпеня (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у Лісабоне падпісана трохбаковае гандлёвае пагадненне паміж Англіяй, Іспаніяй і Партугаліяй. Гэта расцэньваецца ў мадрыдскіх дыпламатычных кругах як прызнак таго, што Іспанія рашыла падтрымліваць дружаственыя адносіны з Англіяй і Партугаліяй. Пагадненне прадугледжвае павелічэнне крэдытаў Іспаніі. Іспанія зможа купіць сто тысяч тон хлеба, вялікую колькасць расліннага масла, маіса, тэкстыльнага валакна, цукру і кофе. Непасрэдным эфектам пагаднення будзе паляпшэнне крайне цяжкага становішча Іспаніі са снабжэннем хлебам.

Водгукі Балгарыі на рашэнні Балтыйскіх рэспублік аб уступленні ў састаў СССР

САФІЯ, 25 ліпеня (ТАСС). Балгарскі друк, асабліва газета „Зора", прадаўжае публікаваць паведамленні аб задачах новых парламентаў Прыбалтыйскіх дзяржаў і аб вялікім уздыме ў сувязі з агалашэннем у гэтых краінах совецкай улады.

Газета „Зора" і „Утро" змяшчаюць таксама вялікія паведамленні аб мітынгах працоўных Совецкага Саюза, вітаючых рашэнні народных парламентаў Латвіі, Літвы і Эстоніі.

„Зора" змяшчае на першай старонцы вялікія карты трох Прыбалтыйскіх рэспублік, „Утро" публікуе артыкул аб літаратуры Латвіі, Літвы і Эстоніі.

Балгарская грамадскасць горача вітае жаданне народаў Літвы, Латвіі і Эстоніі ўступіць у сям'ю народаў Совецкага Саюза.

Учора на імя паўпрэдства СССР у Сафіі атрымана ад балгара-совецкага таварыства горада Троян тэлеграма наступнага зместу:

„Прыяцелі СССР у Троянe шчыра радуюцца далучэнню Літвы, Латвіі і Эстоніі да свабодных і шчаслівых народаў вялікага Совецкага Саюза. Няхай ўмацоўваюцца яго намаганні ў барацьбе за перамогу міжнароднай праўды".

Новы румынскі закон

БЕРЛІН, 25 ліпеня (ТАСС). Інфармацыйнае бюро перадае, што ў Румыніі выдан закон, які забараняе забастоўкі і лакауты, адначасова прадпрыемцам дазваляецца павялічваць рабочы дзень.

Становішча ў Варшаве

Берлінскае радыё паведаміла аб становішчы ў Варшаве.

Насельніцтва горада ўзрасло з 1,4 мільёна жыхароў да 1,8 мільёна. У горадзе вядуцца аднаўленчыя работы. 25 ліпеня (ТАСС).

Германскае паведамленне

БЕРЛІН, 26 ліпеня (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што германскія самалёты ўчора ў Ла-Маншы патапілі 11 англійскіх суднаў таннажам у 43 тысячы тон. Тры параходы моцна пашкоджаны. На новым англійскім эсмінцы ўзнік пажар. Другі эсмінец цяжка пашкоджан.

Паветраны бой ў Лівіі

ЛОНДАН, 26 ліпеня (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Рэйтэр камандванне ваенна-паветраных сіл у Каіры аб'явіла ўчора, што англійскія бамбардыроўшчыкі зрабілі налёт па аэрадром Дэрна (Лівія). Скінуты бомбы на 50 італьянскіх самалётаў, якія знаходзіліся на аэрадроме. Нанесены значныя пашкоджанні. У адбыўшымся бою збіта 5 непрыяцельскіх знішчальнікаў.

Рашэнне французскага нацыянальнага камітэта ў Каіры

ЛОНДАН, 26 ліпеня (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, на адбыўшымся ў Каіры першым пасяджэнні французскага нацыянальнага камітэта прынята рэзалюцыя прадаўжаць барацьбу разам з Англіяй. Камітэт накіраваў Дэ Голю тэлеграму, у якой падкрэслівае ўпэўненасць у перамозе саюзнікаў.

Асігнаванні на абарону Турцыі

АНКАРА, 25 ліпеня (ТАС). Меджліс зацвердзіў дадатковыя асігнаванні на абарону ў сум мільёны лір.

Адстаўка Авеноля

НЬЮ-ЙОРК, 26 ліпеня (ТАС). Як паведамляе Асошыэйтэд Прэс, генеральны сакратар Лігі нацый Авеноль вышаў у адстаўку.

Гітлер прыняў румынскіх міністраў

БЕРЛІН, 26 ліпеня (ТАСС). Інфармацыйнае бюро паведамляе, што Гітлер сёння прыняў румынскага прэм'ера Жыгурту і міністра замежных спраў Маніолеску. Гутарка прадаўжалася дзве з палавінай гадзіны.

Законапраект аб абавязковай воінскай павіннасці ў ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 24 ліпеня (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Асошыэйтэд Прэс, сенацкая камісія па ваенных справах адобрыла законапраект аб увядзенні абавязковай воінскай павіннасці ў ЗША. Законапраект прадугледжвае прыцягненне да воінскай службы штогод каля 1,5 мільёна мужчын ва ўзросце ад 21 да 30 год. Сенацкая камісія адобрыла таксама рашэнне аб устанаўленні тэрміна ваеннага навучання ў адзін год.

Л. СОБАЛЕЎ

„Матроская рота"

У студзені 1940 года над Балтыкай уноў прагучэлі словы, ад якіх вее славай дзевятнаццатага года, — „матроская рота". Старая баявая слава балтыйскіх матросаў-рэвалюцыі ажыўшай легендай устала над краінай, непахісная і неўпаўная, якой яна была ў незабыўныя годы грамадзянскай вайны. Трэцяе пакаленне балтыйцаў праз дваццаць год, падхапіўшы гераічную эстафету, узняла гэту старую славу на новую вышыню, пакрыла яе новымі подвігамі ў імя рэвалюцыі, у імя рэдзімы, у імя Сталіна.

Гэтая назва — „матроская рота" — не ўвайшла ні ў загады, ні ў зводкі. Яна нарадзілася сама сабой у заснежаных лясах на беразе фінскага заліва, дзе ў лютай стужкі, бок аб бок з часцямі Чырвонай Арміі балтыйскія чырвонафлотцы прагрызалі лінію Манэргейма. Як у дні грамадзянскай вайны, калі на заклік Леніна Балтыка хутка выставіла першы экспедыцыйны атрад у 10 тысяч матросаў, так і цяпер Чырвонасцяжны Балтыйскі флот паслаў на бераг сваіх байцоў. Гэта была флоцкая моладзь, у веліэарнай большасці сваёй комсамольцы — былыя флоцкіх школ, ледзь пачуўшыя службу, артылерысты берагавой абароны, чырвонафлотцы караблёў, скаваных ільдом, чырвонафлотцы кранштадзкіх фартоў. „Матроскай ротай" у гэтым атрадзе празвалі лыжнікаў-чырвонафлотцаў.

* * *

Марозная ноч. Нерухома і таямнича стаіць гушчар высокіх соснаў і толькі па таму, як ён абрываецца, быццам зрэзаны нажом, разумела, што тут бераг скончаўся і пачаўся лёд. Бераг і лёд аднолькава завалены глыбокім — па пояс — снегам, і белая яго пелена ўходзіць у бесканцовасць, у бялесую наверную імглу шчарбатага месяца. У таямнічым гэтым мігаценні бясшумна і хутка праносяцца белыя цені. Яны падобны на здані, і толькі па гарачаму дыханню, чутнаму, калі цені гэтыя праходзяць шчыльна каля цябе, адгадваеш пад белымі халатамі маладыя, разгарачаныя целы. Гэта „матроская рота" пайшла на лёд. Куды? Можа быць у абход на дзесяткі кілометраў у тыл астраўной белафінскай батарэі, можа быць ў смелы рэйд па глыбокіх тылах, можа быць — у разведку ў такія-ж густыя, таямнічыя лясы, дзе страляе кожнае дрэва і ўзрываецца кожны пень, можа быць у дзёрзкую лобавую атаку прыбярэжных умацаванняў... Усюды пабывалі нашы балтыйскія лыжнікі і ўсюды яны наносілі ворагу адчувальныя ўдары.

Іх вадзіў туды капітан Ласякоў, вадзіў і тады, калі голас яго, прастужаны ў пяцісутачным ляжанні на ільду, не стаў чутным, і для перадачы каманды прышлося трымаць пры сабе аднаго з лыжнікаў у якасці „узмацніцеля". Ён вадзіў іх і тады, калі прастрэляная левая рука павісла на перавязі, а абмарожаны твар знік пад бінтамі, вадзіў і тады, калі атрымаў другую рану.

Быў такі закон у балтыйскім атрадзе: комуніст і комсамолец — беражы ў бою свайго камандзіра. І вось як ён выконваўся.

Невялікая група чырвонафлотцаў — лыжнікаў, якая была на разведцы ў тылу ворага, аказалася ў цяжкім становішчы. Раптоўна ўспыхнуўшы пражэктар і лівень ружэйна-кулямётнага агню, хлынуўшы з засады, аддзялілі гэтую групу ад астатняга атрада, і яна папала ў акружэнне мацнейшага праціўніка. Камандзір аддзялення Марозаў адразу-ж быў ранен. Тады каманду прыняў на сябе намеснік палітрука Нікалай Добраскокаў. Ён сумеў вывесці чырвонафлотцаў з агня і павёў на прарыў. У жорсткім рукапашным баі, дзейнічаючы штыком, гранатай і куляй, прабіваючыся скрозь гушчар лесу, скрозь пераважаючыя сілы ворага, уходзілі да сваіх чырвонафлотцаў лыжнікі. Сярод іх выдатна біўся комсамолец Александр Пасконкін, малады чырвонафлоцец, пачаўшы флоцкую службу ўсяго 4 месяцы назад. Ён паспеў ужо ўлажыць штыком і гранатай шэсцярых белафінаў, калі раптам у наверным святле месяца прымеціў на снягу перакатваючуюся груду цел: гэта белафін „уручную" душыў Марозава, прыдавіўшы яго ўсім сваім целам і не даючы таму выцягнуць прыціснуты ім наган.

Пад градам куль, ляцеўшых з гушчара, Пасконкін рынуўся на дапамогу да камандзіра. Ізлаўчыўшыся, ён скінуў з яго ворага ўдарам штыка, падхапіў Марозава сабе на плечы і, адстрэльваючыся, вынёс яго з бою. Ён пранёс яго на сабе па ільду 9 кілометраў да берага, здаў на перавязачны пункт, паправіў лыжы і паімчаўся да атрада...

Імклівыя і выносліва лыжнікі чырвонафлотцы былі той баявой часцю, якую можна было паслаць куды хочаш — у шасцідзесяцікілометравы марш на астравы, у раптоўны налёт на фланг на выручку і падтрымку да атакуючых умацаванні часцей. Але яны-ж ўмелі, калі патрэбна, суткамі ляжаць на ільду.

Гэта было ў сярэдзіне лютага. Мароз канчаткова распаясаўся, і 30 градусаў ніжэй нуля лічылася „цёплым надвор'ем". Балтыйскі атрад браў берагавыя супроцьдэсантныя ўмацаванні. Яны былі размешчаны на гары, у лесе, скрытыя, пад снегам і галінамі бронавыя і бетонныя ДОТ'ы. Лес перад імі быў поўны снайпераў, якія гняздзіліся на дрэвах у мехавых спальных мяшках і на выбар білі па любой цэлі, паказаўшайся на снежным пляжы і на ільду перад берагам. Балтыйцы залеглі ў таросах, у чатырохстах метрах ад берага. Пяць сутак правялі яны на ільду, хаваючыся за таросамі. Дастаткова было прыпадняць над ільдзінай шлём, каб у яго шчоўкнула куля снайпера або кароткай, дакладнай чаргой хлясну кулямёт з амбразуры ДОТ'а. Чатырыста метраў роўнага ільду, засыпанага снегам, былі непрахадзімы. Але чырвонафлотцы перамаглі гэты страшэнны голы прастор і ўварваліся ва ўмацаванні.

У дзень балтыйцы ляжалі за таросамі, зрэдку забаўляючыся паляваннем за снайперамі. Ноччу-ж таросы ажывалі. З тылу па ільду прыходзілі з берага друзя-балтыйцы. Яны прывозілі на санках, на спараных лыжах цынкі з патронамі, термасы з гарачым флоцкім баршчом, родную газету „Боевая Балтийская", друкаваную тут-жа ў лесе на хітрым агрэгаце з грузавіка, фанеры і друкарскай машыны, якую самааддана вярцеў сам рэдактар, заманяючы матор. Потым з заходу месяца чырвонафлотцы пускаліся ў небяспечны шлях па адкрытаму прастору, дзе, акрамя снегу, не было ніякага прыкрыцця ад куль.

Ім дапамагала дакладная стральба балтыйскіх артылерыстаў. Далёкая батарэя клала снарады ў ДОТ'ы і перад імі прашывала шрапнеллю прыбярэжны лес, усеяны снайперамі. Але ні адзін снарад не падаў у заветны прастор у чатырыста метраў паміж таросамі і берагам, пакідаючы дарогу для наступлення. За гэтым сачыў малады лейтэнант, „паўпрэд" артылерыі на ільду: за многа кілометраў ад сваёй батарэі ён карэктываў агонь, карыстаючыся паслугамі радыста Андрэева, прыцягнуўшага трафейную фінскую пераносную станцыю.

Верачы ў дакладнасць балтыйскай артылерыі, чырвонафлотцы па аднаму адпраўляліся ў „падснежнае плаванне", ушчыльную к разрывам нашых снарадаў. Яны пакідалі непатрэбныя ім цяпер лыжы, вырывалі ў снягу перад таросамі падабенства снежнай ванны, лажаліся ў яе і стальным шлёмам, адзетым на галаву, пачыналі свідраваць ход у снежнай сцяне. Павольна, метр за метрам, яны паўзлі ў снягу, як краты, скрываючыся ад тых белафінскіх стралкоў, якіх не адагнала ад амбразур артылерыя. Яны прапаўзалі так адкрыты прастор, дабіраліся да берага і там акапваліся, зарываючыся ў снег і ў зямлю на ўвесь наступны дзень.

На чацвертым сутці белафіны, відавочна, зразумелі гэты манеўр. Яны рашылі разлічыцца з балтыйскім атрадам. На дапамогу асаджаемым умацаванням прышла цяжкая артылерыя вострава Біорке. Яна адкрыла агонь.

Першы дзесяцідзюймовы снарад разарваўся метрах у двухстах ад таросаў, дзе засеялі балтыйцы. Чорная вада прастуміла ва ўтварыўшымся маленькім возеры. Адна справа — быць пад абстрэлам цяжкімі снарадамі на зямлі, а зусім другая — на ільду. Чорнае возерка вады пераканаўча даказвала гэту розніцу. І радыст Андрэеў, малады чырвонафлоцец, да гэтага часу лічыўшыся адважным і спакойным байцом, раптам „здаў", згубіў „палітыка-маральнае становішча". Ён забыў пра свае коды і шыфры, ён закрычаў пранізваючым голасам прама ў мікрафон:

— Таварыш лейтэнант! Нас нашчупала Біорке! Першы снарад прама ў нас! Перадайце на Красную Горку, няхай страляе па Біорке, а то нам капут!..

Новы ўзрыў заглушыў яго словы, снарад упаў там-жа, у аддаленні ад балтыйцаў, і ні аднаго асколка нават і не прасвісталі над таросамі, але Андрэеў прадаўжаў панічна патрабаваць у мікрафон, каб агонь Біорке падавілі, бо другі снарад разарваўся ў самай сярэдзіне атрада...

Да Андрэева падпаўзлі комсамольцы, абураныя і ярасныя. Яны гатовы былі вярваць у яго з рук мікрафон, але Андрэеў прыкрыў мікрафон далонню, сказаў нечага на спакойным і нармальным голасам:

— Не хапай, дура. Яны мяне слухаюць...

І зноў працягваў разводзіць паніку ў эфіры, зорка сочачы за падзеннем белафінскіх цяжкіх снарадаў у воддалі ад таросаў.

Станцыя была, як сказана, трафейная, з поўнай даўжынёй хвалі, і не раз Андрэеву прыходзілася лаяцца на гэтай хвалі з белафінамі. Разлік яго аказаўся правільным: белафіны на Біорке, падслухаўшы „каштоўную інфармацыю" з ільду, узмацнілі агонь. Дзесяткі велізарных снарадаў з упартасцю і дакладнасцю, дастойнымі лепшага прымянення, даўбілі лёд воддалі ад атрада. Хутка там утварылася цэлае возера. Адурачыўшы так ворага доўгі час і выдаткаваўшы ўпустую дастатковую колькасць іх снарадаў, Андрэеў спыніў работу. Спыніўся і абстрэл ні ў чым не вінаватага ільду. Відавочна, на батарэі рашылі, што атрад у таросах знішчаны поўнасцю.

А ноччу лыжнікі сваім „падснежным плаваннем" канчаткова перабраліся на бераг і рынуліся ў рашучую атаку.

Адказны рэдактар Г. Т. Мінчук

Адрас рэдакцыі: г. Брэст, вуліца імені Карла Маркса 29. Тэлефоны 1—17, 1—23, 6—15 Друкарня ім. Варашылава Абліт 1...